УДК 94(476):502.1

**І. В. Пугач**
Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка

# ІНСТЫТУЦЫЯНАЛЬНАЕ РАЗВІЦЦЁ ЛЯСНОЙ ВАРТЫ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯЎ У 30-Я ГГ. XIX– ПАЧАТКУ XX СТ.

Артыкул прысвечаны праблеме інстытуцыянальнага развіцця лясной варты на тэрыторыі беларускіх губерняў у 30-я гг. XIX– пачатку XX ст. У адзначаны перыяд лясныя рэсурсы productivity ады-грывалі адну з вядучых ролей у гаспадарчым жыцці краю. Прадукты лясной гаспадаркі актыўна выкарыстоўваліся ў якасці будаўнічых матэрыялаў, паліва, забяспечвалі патрэбы насельніцтва ў драўніне, накіроўваліся на экспарт і г. д. Да канца XIX ст. прыватнае лесаўладанне пакідалася па-за кантролем з боку дзяржавы. Таму значная частка адпаведнай нагрузкі прыходзілася на казённыя лясы. У сувязі з гэтым урад Расійскай імперыі ажыццяўляў шэраг захадаў па арганізацыі і ўдасканаленні аховы гэтай катэгорыі лясоў. Непасрэдна некаторыя лесагаспадарчыя функцыі, а таксама папярэджванне, выяўленне і спыненне самавольных высечак, наўмысных і ненаўмысных лясных пажараў ажыццяўляліся прадстаўнікамі інстытута лясной варты. У змесце артыкула адлюстраваны асноўныя захады ўрада ў дадзеным кірунку, а таксама прыведзена характарыстыка вядучых разнавіднасцей лясной варты, якія ахоўвалі казённыя лясы Беларусі ў адзначаны перыяд. На падставе аналізу інфармацыі крыніц робіцца выснова пра паспяховасць інстытуцыянальнага развіцця лясной варты ў краі.

**Ключавыя словы:** ахова казённых лясоў, беларускія губерні, часовая лясная варта, пастаянная лясная варта, ваенна-лясная варта, стралкі стралковых батальёнаў, казённая лясная варта.

**I. V. Pugach**
Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank

# INSTITUTIONAL DEVELOPMENT OF THE FOREST GUARD IN THE TERRITORY OF THE BELARUSSIAN PROVINCES IN THE 30s XIX$^{TH}$ – EARLY XX$^{TH}$ CENTURY

The article is devoted to the problem of the institutional development of the forest guard on the territory of the Belarusian provinces in the 30s of the XIX$^{th}$ – early XX$^{th}$ cent. During this period, forest resources played one of the most important roles in the economy of the region. Timber was actively used as building materials, fuel, provided the population with wood needs, was exported, etc. Until the end of the XIX$^{th}$ century, economic activity in private forests was not controlled by the state. Therefore, a significant part of the load fell on state forests. So the government of the Russian Empire took a number of measures to develop a state forest conservation system. Directly some forestry functions, prevention and disclosure of illegal logging, intentional and unintentional forest fires were carried out by representatives of the forest guard institute. The content of the article reflects the main measures of the government in this direction, gives a description of the types of forest guards that protected the state forests of Belarus in the noted period. Based on the analysis of information from the sources, a conclusion is drawn about the success of the institutional development of the forest guard in the region.

**Key words:** state forests protection, Belarusian provinces, temporary forest guard, permanent forest guard, military forest guard, shooters of the rifle battalions, state forest guard.

**Уводзіны.** Да канца 30-х гг. XIX ст. лясная варта, якая дзейнічала на тэрыторыі Расійскай імперыі ў цэлым і беларускіх губерняў у прыватнасці, насіла пераважна часовы характар. Большасць яе прадстаўнікоў абіраліся на сходах з асяроддзя дзяржаўных сялян на тэрмін ад 1 да 3 гадоў. Па заканчэнні тэрміну вартаўнікі вярталіся ў абшчыну, а ў варту прызначаліся новыя сяляне. Аднак абавязковы характар працы, адсутнасць узнагароды за яе і залежнасць ад сялянскай абшчыны абумоўлівалі нядзольнасць часовай лясной варты да рэалізацыі эфектыўнага нагляду за лясамі на лакальным узроўні [1, с. 230]. Адзначанае абумоўлівала неабходнасць перагляду падыходаў да арганізацыі яе дзейнасці.

**Асноўная частка.** З улікам вышэйпералічанага, урад Расійскай імперыі ўзяў курс на рэфармаванне інстытута лясной варты. 28 снежня 1832 г. было прынята рашэнне аб утварэнні пастаяннай лясной варты [2]. Яна складалася з сем’яў пастаяннай лясной варты і аб’ездчыкаў, якія абіраліся з сямейных дзяржаўных сялян і сямейных адстаўных ваенных ніжэйшых чыноў. Тэрмін службы вартаўнікоў складаў 20 гадоў. Па стане здароўя ці за неналежныя паводзіны яны маглі пакінуць пасаду датэрмінова. Прад-

стаўнікі пастаяннай лясной варты вызваляліся ад выплаты падаткаў і выканання павіннасцей. У кожнай сям'і, акрамя гаспадара, павінна было быць не менш за трох членаў мужчынскага полу, адзін з якіх – старэйшы за 50 гадоў, каб мог часова ахоўваць лясы, другі – ва ўзросце ад 20 да 35 гадоў для паступлення ў стралкі, а трэці, не маладзейшы за 12 гадоў прызначаўся ў дапамогу гаспадару. Калі сям'я не адпавядала гэтаму рэгламенту, патрабавалася наяўнасць аднаго, акрамя гаспадара, яе члена, здольнага да службы ў стралках і аднаго малалетняга. У дапамогу такой сям'і прызначаўся палясоўшчык, які знаходзіўся на ўтрыманні гаспадара двара. Пры ўстанаўленні лясной варты перавага аддавалася сем'ям, у якіх хаця б адзін з членаў быў пісьменным. За стралкамі пастаяннай лясной варты і аб'ездчыкамі замацоўваліся абыходы і аб'езды адпаведна. Абавязкі стралкоў заключаліся ў ахове лясоў ад самавольных высечак, пажараў, незаконнага выпасу жывёлы, зборы ляснога насення, сеянні, садцы і клеймаванні дрэў і г. д. Да функцый аб'ездчыкаў адносіліся кантроль за выкананнем сем'ямі пастаяннай лясной варты сваіх абавязкаў, забеспячэнне іх абмундзіраваннем і жалаваннем, нагляд за даручанымі аб'ездамі і недапушчэнне парушэнняў ляснога заканадаўства. Для засялення сям'і лясной варты з сямейных дзяржаўных сялян з казны вылучалася 100 руб., а з адстаўных ніжэйшых чыноў – 200 руб. На тэрыторыі беларускіх губерняў вартаўнікам адводзіліся зямельныя ўчасткі ад 12 да 40 дзес. у залежнасці ад мясцовых умоў. Іх заробак складаў 15 руб. у год [3, арк. 218–222; 4, арк. 8 адв.; 5, арк. 57].

Першапачаткова пастаянная лясная варта засноўвалася ў Санкт-Пецярбургскай, Маскоўскай, Варонежскай і Кацярынаслаўскай губернях, а затым з улікам атрыманага вопыту ў астатніх губернях. Важным крокам у яе арганізацыі на тэрыторыі беларускіх губерняў стала выданне Міністэрствам дзяржаўных маёмасцей прадпісання ад 30 верасня 1842 г. «О предположении о водворении постоянной лесной стражи в Западных губерниях и Белостокской области» [3, арк. 192–192 адв.]. У адпаведнасці з яго зместам мясцовыя палаты дзяржаўных маёмасцей павінны былі выказаць свае меркаванні па аптымізацыі ўстанаўлення пастаяннай лясной варты і перадаць іх II Дэпартаменту дзяржаўных маёмасцей, да юрысдыкцыі якога адносілася каардынацыя аховы лясоў краю.

З мэтай павышэння эфектыўнасці аховы казённых лясоў 13 лютага 1846 г. быў выдадзены закон, які прадугледжваў, працягваючы фармаванне пастаяннай лясной варты, стварэнне ваенна-лясной варты на добраахвотнай аснове з адстаўных ніжэйшых чыноў і чыноў, што знаходзіліся ў бестэрміновым адпачынку [3, арк. 23–27; 6]. Кожнаму ваенна-лясному вартаўніку даручаўся абыход згодна з мерай абыходаў, прынятай для стралкоў пастаяннай лясной варты. Па сутнасці яны мелі такія ж правы і прывілеі, якімі карысталіся і прадстаўнікі пастаяннай лясной варты. У межах даручаных абыходаў для вартаўнікоў узводзіліся жылыя хаты. Акрамя таго, вартаўнікі атрымлівалі надзелы ворнай зямлі плошчай ад 0,5 да 1 дзес. і ўчасткі для выпасу жывёлы і пакосу. Прадпісаннем ад 28 лютага 1855 г. плошча апошніх вызначалася ў межах 1–3 дзес. [7, арк. 53–54 адв.]. На даручаных абыходах вартаўнікі мелі права збіраць плады і паляваць. Для набыцця разнастайных прыстасаванняў для дома было прадугледжана вылучэнне такой жа сумы, якая прызначалася на кожны двор пастаяннай лясной варты. Жалаванне ваенна-лясных вартаўнікоў складала 15 руб. у год. Да таго ж ім дазвалялася ўсынаўляць гадаванцаў выхаваўчых дамоў па тых жа правілах, як і для дзяржаўных сялян, а таксама перадаваць дзецям пасаду разам з гаспадаркай.

З першай паловы 1850-х гг. прымаліся захады па камплектаванні складу лясной варты ніжнімі чынамі стралковых батальёнаў, якія праслужылі 15 гадоў з тым, каб астатні тэрмін даслужыць у лясным ведамстве. Пры ўладкаванні іх надзялялі 1 дзес. зямлі і нармаваным харчовым забеспячэннем [8, с. 11]. На пабудову і абсталяванне іх дамоў вылучалася сума ў 200 руб. [3, арк. 139]. З паступленнем у лясную варту унтэр-афіцэры на добраахвотнай аснове прызначаліся ў якасці аб'ездчыкаў, а радавыя – стралкамі [8, с. 5]. Каб пазбегнуць адцягвання ад аховы лясоў, стралкі вызваляліся ад вучэбных вайсковых збораў [8, с. 7]. Па заканчэнні тэрміну службы ў лясной варце стралкі маглі быць адпраўлены ў адстаўку ці застаццаляснымі вартаўнікамі і атрымліваць павялічанае на 50% жалаванне [8, с. 8].

Галоўнымі абавязкамі прадстаўнікоў усіх тыпаў лясной варты былі ахова лясоў ад самавольных высечак, пажараў, расчышчэнне і ўзнаўленне некаторых лясных межаў, улік высечанага лесу, збор драўнянага насення і г. д. [2; 3, арк. 139; 6; 8, с. 17–32]. За неналежнае выкананне сваіх абавязкаў лясныя вартаўнікі падлягалі адпаведнай адказнасці. За крымінальныя і службовыя злачынствы чыны лясной варты перадаваліся ваеннаму суду [8, с. 32].

Трэба адзначыць, што Міністэрства дзяржаўных маёмасцей не здолела своечасова сфармаваць пастаянную лясную варту ў беларускіх губернях. Так, у 1846 г. яе ўдзельная вага на тэрыторыі Беларусі складала 9,6%. Найбольшы паказчык быў у Гродзенскай губерні (каля 19%), а найменшы – у Магілёўскай (каля 5%). Пры гэтым у Гродзенскай губерні ў адзначаныя

гады захоўваліся пасады лясной варты, якія былі характэрны яшчэ для перыяду ўваходжання краю ў склад Рэчы Паспалітай. У 1846 г. тут было 44 т. зв. «стражников», якія выконвалі функцыі, адпаведныя функцыям аб'ездчыкаў, і 123 асочнікі, абавязкі якіх былі падобныя да абавязкаў палясоўшчыкаў, ці 13,97% ад агульнай колькасці вартаўнікоў губерні [падлічана: 9]. Гэта прывяло да выдання шэрагу прадпісанняў і загадаў для выпраўлення сітуацыі [3, арк. 12–14, 62; 4, арк. 11 адв.; 10, арк. 218–219]. Асноўны іх змест быў накіраваны на актывізацыю дзейнасці мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання па тлумачэнні адпаведным катэгорыям насельніцтва ўсіх прадугледжаных заканадаўствам прывілеяў, зніжэнне патрабаванняў да кандыдатаў і іх сем'яў і г. д. Нягледзячы на гэтыя захады, фармаванне лясной варты зацягвалася. Кадравая сітуацыя абвастрылася з-за прызыву на абавязковую службу бестэрміноваадпускных чыноў у 1848 г. у сувязі з рэвалюцыйнымі падзеямі ў краінах Еўропы. Згодна з ведамасцю аб колькасці ніжэйшых чыноў, якія праслужылі 20 гадоў і знаходзіліся ў бестэрміновым адпачынку, у Гродзенскай губерні такіх было 235 чал., Магілёўскай – 244 чал., Віцебскай – 251 чал., Віленскай – 278 чал. і Мінскай – 287 чал. [3, арк. 66, 71 адв.]. Умацаванне лясной варты стралкамі стралковых батальёнаў было парушана ў сувязі з Крымскай вайной. 27 мая 1854 г. міністр дзяржаўных маёмасцей прадпісаў узмацніць фармаванне ваенна-лясной і пастаяннай лясной варты [3, арк. 170–170 адв.]. Нягледзячы на гэта, заставаліся вакансіі вартаўнікоў. У 1856–1857 гг. доля рэфармаванай варты ў краі складала 17,1%. Найбольшы адпаведны паказчык быў характэрны для Мінскай губерні (каля 22,14%), а найменшы – для Віленскай (каля 9%) [падлічана: 9].

Трэба сказаць, што часам ад сялян паступалі скаргі на парушэнне правілаў фармавання пастаяннай лясной варты. У сувязі з гэтым прадпісаннем ад 8 жніўня 1847 г. на палаты дзяржаўных маёмасцей ускладалася адказнасць за любое адступленне ад правілаў устанаўлення пастаяннай лясной варты [3, арк. 17]. Рэфармаванне лясной варты было запавольнена і парушэннямі, на якія ўказвалі ў сваіх гадавых справаздачах віцэ-інспектары Корпуса ляснічых. Так, яны ўстанавілі, што некаторыя дамы лясной варты былі непрыдатнымі для жыцця, а некаторыя сем'і вартаўнікоў жылі ў беднасці з-за недахопу вылучаных зямель. У сувязі з гэтым віцэ-інспектары былі ўпаўнаважаны рабіць распараджэнні аб ліквідацыі недахопаў і запазычваць у палатах дзяржаўных маёмасцей суму да 500 руб. з наступным кампенсаваннем гэтай сумы вінаватымі [3, арк. 171–172 адв.]. Характэрныя для беларускіх губерняў нізкія тэмпы рэфармавання лясной варты абумовілі захаванне вялікай колькасці палясоўшчыкаў. Гэта прадвызначала наяўнасць пэўных нормаў, якія рэгулявалі іх становішча ў новай кан'юнктуры. Аб гэтым сведчыць шэраг загадаў і прадпісанняў, накіраваных на засяроджванне ўвагі адказнымі органамі дзяржаўнага кіравання і ляснымі чыноўнікамі на належным забеспячэнні, ладзе жыцця палясоўшчыкаў, а таксама на кантролі выканання ўскладзеных на іх абавязкаў [2, арк. 9–11; 4, арк. 11 адв.; 7, арк. 40]. Так, калі ў 1846 г. у краі доля нерэфармаванай варты дасягала каля 90% (каля 71% ад усёй колькасці вартаўнікоў складалі палясоўшчыкі), то ў 1856–1857 гг. – прыблізна 83% (каля 65% ад усёй колькасці вартаўнікоў складалі палясоўшчыкі) [падлічана: 9]. Такім чынам, урад здолеў дасягнуць пэўных поспехаў у рэфармаванні лясной варты ў краі ў 40-х – канцы 50-х гг. XIX ст. Аднак яна захоўвала шматукладны і ў значнай ступені часовы характар, што з'яўлялася істотнай акалічнасцю, якая стрымлівала рост эфектыўнасці аховы казённых лясоў.

Наступны крок па ўдасканаленні інстытута лясной варты быў здзейснены ўрадам 3 чэрвеня 1869 г. і выявіўся ў выданні «Положения о лесной страже в казённых лесах» [11]. З гэтага часу яна складалася з аб'ездчыкаў і леснікоў. Колькасць варты ў кожным лясніцтве вызначалася на падставе прадстаўленняў мясцовых упраўленняў і зацвярджалася міністрам дзяржаўных маёмасцей. У лясную варту маглі паступаць асобы ўсіх саслоўяў старэйшыя за 21 год, віталася пісьменнасць. Па меры ўстанаўлення новага тыпу варты на месцах прадстаўнікі іншых тыпаў спынялі сваю дзейнасць. Пры гэтым калі былыя лясныя вартаўнікі бездакорна неслі службу і адпавядалі патрабаванням, то яны маглі быць прыняты ў склад казённай лясной варты. Для тых вартаўнікоў, хто не пажадаў працягваць службу, былі прадугледжаны надзяленне ўчасткамі зямлі, пэўныя ільготы ад выканання дзяржаўных падаткаў, рэкруцкай павіннасці, пры ўзносе выкупных плацяжоў і г. д. Аб'ездчыкам прызначалася плата ад 150 да 200 руб. у год з абавязкам утрымліваць на свой кошт каня, а леснікам – ад 60 да 90 руб. У 1896 г. максімальны заробак аб'ездчыкаў павялічыўся да 250 руб. у год, а леснікоў – 100 руб. у год. Памер платы вызначаўся зыходзячы са ступені цяжкасці аховы даручаных лясоў і патрэб вартаўнікоў. Плата магла прызначацца ці толькі грашыма, ці грашыма і зямлёй. Пры гэтым плошча зямельных надзелаў не павінна была перавышаць 20 дзес. на кожнага вартаўніка. Ацэнка зямлі вызначалася па сярэдняй арэнднай плаце з дзесяціны ў пэўнай мясцовасці. Павелічэнне даходу з адведзенага аб'ездчыку ці

лесніку ўчастка зямлі не магло быць нагодай для змянення прызначанага яму пры паступленні на службу грашовага акладу. Акрамя таго, вартаўнікі абавязкова забяспечваліся зямельнымі надзеламі ў 1,5 дзес. пад дом і сядзібу. Пры неабходнасці будаваліся лазня, канюшня, свіран, хлеў і склеп. Будаўніцтва і рамонт дамоў і дваровых пабудоў ажыццяўляліся за кошт казны. Пры гэтым чынам варты дазвалялася ўзводзіць і іншыя будынкі ў межах сядзібы за свой кошт. Па звальненні са службы вартаўнікі абавязаны былі пакідаць прыбудовы ў распараджэнне лясного ведамства без кампенсацыі. Тыя прадстаўнікі лясной варты, якія не забяспечваліся дамамі, атрымлівалі кватэрныя грошы ў памеры 18 руб. штогод. Дом і зямельны ўчастак, складаючы ўласнасць казны, прызначаліся для карыстання чыноў варты толькі на тэрмін службы. Усе аб'ездчыкі і леснікі забяспечваліся стрэльбамі ад казны. За іх належным станам павінны былі сачыць ляснічыя. Пры прызначэнні на службу чыны лясной варты прыводзіліся да прысягі міравым суддзёй, пасля чаго лічыліся дзяржаўнымі служачымі. Да рэалізацыі судовай рэформы і ўзнікнення міравых суддзяў на тэрыторыі Беларусі чыны варты прыводзіліся да прысягі ў павятовых судах. Аб'ездчыкі і леснікі на ўвесь час службы асабіста вызваляліся ад выканання натуральных мірскіх павіннасцей. Аб'ездчыкам і леснікам, якія атрымалі пры выкананні сваіх службовых абавязкаў цяжкія раны і калецтвы, а ў выпадку гвалтоўнай смерці – іх сем'ям выдавалася грашовая дапамога. Недабранадзейныя чыны лясной варты неадкладна звальняліся са службы. У выпадку, калі вартаўнікі прымалі рашэнне пакінуць службу па ўласным жаданні, яны былі абавязаны не пазней як за месяц папярэдзіць пра гэта ляснічага. Для аптымальнага размеркавання абавязкаў і нагрузкі сярод вартаўнікоў, лясніцтвы падзяляліся на абыходы і аб'езды. Леснікі павінны былі ведаць межы сваіх абыходаў, ахоўваць участкі ад незаконных захопаў, вынішчэння межавых і лесагаспадарчых знакаў, ад пажараў, несанкцыянаваных высечак, несанкцыянаваных выпасу жывёлы і пакосу травы, весці ўлік нарыхтаваных лесаматэрыялаў і г. д. Аб усялякіх парушэннях леснікі павінны былі даносіць аб'ездчыку ці ляснічаму. Аб'ездчыкі былі абавязаны ведаць і ахоўваць межы сваіх аб'ездаў, сачыць за выкананнем леснікамі іх абавязкаў, улічваць асабіста і правяраць улікі леснікоў па лясных нарыхтоўках, не дапускаць і праследваць усялякія парушэнні [12, арк. 1–5; 11; 13–15].

Характар уладкавання і забеспячэння казённай лясной варты рабілі яе даволі эфектыўным інструментам органаў дзяржаўнага кіравання ў справе аховы лясоў. Да канца 70-х гг. XIX ст. лясная варта, якая дзейнічала на тэрыторыі беларускіх губерняў, была цалкам сфармавана па палажэнні 3 чэрвеня 1869 г. Трэба адзначыць, што лясная варта магла ўзмацняцца часовымі вартаўнікамі. У беларускіх губернях у канцы XIX–пачатку XX ст. яны складалі каля 2% ад усёй колькасці варты. Пры гэтым паказчык лясной варты новага ўзору для Расійскай імперыі вагаўся ад 77% у 1892 г. да 86% у 1907 г. У той жа час доля казённай лясной варты на тэрыторыі Беларусі складала 98%. Гэтая акалічнасць можа сведчыць пра адносна высокі ўзровень развіцця інстытута лясной варты ў Беларусі. Можна меркаваць, што такі высокі паказчык быў прадвызначаны істотным паляпшэннем умоў уладкавання і працы лясной варты, з аднаго боку, і яе дастатковым колькасным складам з іншага [11; 12, арк. 1–5; 16, с. 2–5; 17, с. 30–34].

**Заключэнне.** Такім чынам, на працягу разглядаемага перыяду лясная варта, якая ажыццяўляла дзейнасць па ахове лясоў на тэрыторыі беларускіх губерняў, прайшла значны шлях інстытуцыянальнага развіцця. Шэраг мерапрыемстваў, рэалізаваных урадам ў адпаведным кірунку, стварыў неабходныя ўмовы для пераадолення часовага і шматукладнага характару арганізацыі інстытута і пераўтварыў яго ў даволі стабільны, дасканалы і аўтаномны інструмент органаў дзяржаўнага кіравання ў справе аховы лясоў.

## Літаратура

1. Арнольд Ф. К. История лесоводства в России, Франции и Германии. СПб.: Издание А. Ф. Маркса, 1895. 403 с.
2. Полное собрание законов Российской империи (ПСЗРИ). 2-е собр. Т. 7. Отд. 1. № 5869. С. 943–956.
3. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Мінску (НГАБ). Ф. 27. Воп. 1. Спр. 44.
4. НГАБ. Ф. 2514. Воп. 1. Спр. 1348.
5. НГАБ. Ф. 2514. Воп. 1. Спр. 1895.
6. ПСЗРИ. 2-е собр. Т. 21. Отд. 1. № 19725. С. 247–248.
7. НГАБ. Ф. 2189. Воп. 1. Спр. 322.
8. Положение о комплектовании стрелковых батальонов кантонистами лесной стражи и о комплектовании сей последней нижними чинами стрелковых батальонов. СПб.: Военная типография, 1851. 36 с.
9. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў. Ф. 387. Воп. 28. Спр. 1289, арк. 49; 1290, арк. 59; 1292, арк. 44; 1293, арк. 31; 1312, арк. 84; 1313, арк. 114–115; 1340, арк. 67; 1341, арк. 63–64; 1343, арк. 52; 1344, арк. 54.

10. НГАБ. Ф. 2514. Воп. 1. Спр. 221.
11. ПСЗРИ. 2-е собр. Т. 44. Отд. 1. № 47188. С. 592–594.
12. НГАБ. Ф. 27. Воп. 2. Спр. 604.
13. ПСЗРИ. 2-е собр. Т. 44. Отд. 1. № 46612. С. 45–46.
14. ПСЗРИ. 2-е собр. Т. 44. Отд. 1. № 47586. С. 222–224.
15. ПСЗРИ. 2-е собр. Т. 44. Отд. 1. № 47587. С. 224–225.
16. Ведомость № 2 «Данные за 1892 год, по губерниям, о числе лесничих, помощников лесничих, и лесной стражи и о количестве земельного надела и квартирного их довольствия» // Отчет по лесному управлению Министерства государственных имуществ за 1892 год. Составлен V отделением Лесного департамента. СПб.: Типография Морского министерства в главном Адмиралтействе, 1893. 5 с.
17. Приложение к отчету по лесному управлению за 1907 год // Отчет по лесному управлению за 1907 год. Составлен V отделением Лесного департамента. СПб.: Типолитография Ю. Я. Римана, 1909. 489 с.

## References

1. Arnol'd F. K. *Istoriya lesovodstva v Rossii, Frantsii i Germanii* [History of forestry in Russia, France and Germany]. St. Petersburg, Izdaniye A. F. Marksa Publ., 1895. 403 p.
2. *Polnoye sobraniye zakonov Rossiyskoy imperii* [Complete collection of laws of the Russian Empire]. Vol. 7. Part 1, no. 5869, pp. 943–956 (In Russian).
3. National Historical Archive of Belarus (NHAB). Fund 27. I. 1. F. 44.
4. NHAB. Fund 2514. I. 1. F. 1348.
5. NHAB. Fund 2514. I. 1. F. 1895.
6. *Polnoye sobraniye zakonov Rossiyskoy imperii* [Complete collection of laws of the Russian Empire]. Vol. 21. Part 1, no. 19725, pp. 247–248 (In Russian).
7. NHAB. Fund 2189. I. 1. F. 322.
8. *Polozheniye o komplektovanii strelkovykh batal'onov kantonistami lesnoy strazhi i o komplektovanii sey posledney nizhnimi chinami strelkovykh batal'onov* [Regulation on the acquisition of infantry battalions by the contonists of the forest guard on the acquisition of this last lower rants of infantry battalions]. St. Petersburg, Voennaya tipografiya Publ., 1851. 36 p.
9. Russian State Historical Archive. Fund. 387. I. 28. F. 1289, sh. 49; 1290, sh. 59; 1292, sh. 44; 1293, sh. 31; 1312, sh. 84; 1313, sh. 114–115; 1340, sh. 67; 1341, sh. 63–64; 1343, sh. 52; 1344, sh. 54.
10. NHAB. Fund 2514. I. 1. F. 221.
11. *Polnoye sobraniye zakonov Rossiyskoy imperii* [Complete collection of laws of the Russian Empire]. Vol. 44. Part 1, no. 47188, pp. 592–594 (In Russian).
12. NHAB. Fund 27. I. 2. F. 604.
13. *Polnoye sobraniye zakonov Rossiyskoy imperii* [Complete collection of laws of the Russian Empire]. Vol. 44. Part 1, no. 46612, pp. 45–46 (In Russian).
14. *Polnoye sobraniye zakonov Rossiyskoy imperii* [Complete collection of laws of the Russian Empire]. Vol. 44. Part 1, no. 47586, pp. 222–224 (In Russian).
15. *Polnoye sobraniye zakonov Rossiyskoy imperii* [Complete collection of laws of the Russian Empire]. Vol. 44. Part 1, no. 47587, pp. 224–225 (In Russian).
16. Register no. 2 "Data for 1892, by province, on the number of foresters, forestry assistants, and forest guards and on the number of land allotment and their apartment allowance". *Otchet po lesnomu upravleniyu Ministerstva gosudarstvennykh imushchestv za 1892 god. Sostavlen V otdeleniyem Lesnogo departamenta* [Forest Management Report of the Ministry of State Property for 1892. Compiled by the V branch of the Forestry Department]. St. Petersburg, Tipografiya Morskogo ministerstva v glavnom Admiralteystve Publ., 1893. 5 p.
17. Supplement to the report on forest management for 1907. *Otchet po lesnomu upravleniyu za 1907 god. Sostavlen V otdeleniyem Lesnogo departamenta* [Forest Management for the 1907. Compiled by the V branch of the Forestry Department]. St. Petersburg, Tipolitografiya Yu. Ya. Rimana Publ., 1909. 489 p.

## Інфармацыя пра аўтара

**Пугач Іван Валянцінавіч** – аспірант кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў. Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка (220030, г. Мінск, вул. Савецкая, 18, Рэспубліка Беларусь). E-mail: pugach_ivan@mail.ru

## About the author

**Pugach Ivan Valiantsinavich** – PhD student, the Department of History of Belarus and Slavic Peoples. Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank (18, Savetskaya str., 220030, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: pugach_ivan@mail.ru

*Паступіў 19.02.2020*